# НАША НІВА

Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністрації: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцэй: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнції, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фамліей і адрэсам таго хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць проззішчэ разам з фаміліей,, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад

Год IX. 5 Красавіка 1914 г. № 14

# ХРЫСТОС ЎВАСКРОС!!!

**Чародны нумэр выйдзе 17 красавіка: да нумэру будзе прыложэна кніжка „Вялікодная Пісанка“.**

## У вялікі дзень.

Ен пайшоў на мукі і сьмерць за вялікую справу вызваленьня народоў, за ідэю любві—міласьці да ўсіх бліжніх

Тым, што судзілі Яго за праўду і пакаралі сьмерцьцю, здавалося, што з Ім разам счэзне і Яго навука. Але яны абмыліліся.

Абмыліліся ворагі сьвету, праўды і волі: бо жывая думка, жывое слово, дайшоўшы да вушэй людзкіх, не памірае, а перэтвараецца ў дзела.

Ўваскрос Хрыстос. Хоць адышоў Ен, але дух Яго астаўся між людзьмі. І сьвятая навука любові да чэлавека перэтрывала сотні гадоў.

Праўда, хоць і пануе скрозь вера Хрыста, але не дайшла яна да ўсіх сэрц. Тые, што цяпер—у вялікае сьвята ўспаміну Ўваскрасеньня Хрыста—выказываюць сваю любоў да людзей на словах, часта у сэрцы хаваюць злосць і ненавісць.

Праўда, што і цяпер ешчэ ў імя Божае людзі ідуць на вайну і забіваюць братоў сваіх.

Праўда, што дужэйшые уціскаюць і здзекуюцца над слабейшымі, ды поруч з гэтым не саромяюцца насіць на грудзях крыж—сымвол мук, якіе за людзей, за іх шчасьце і вызваленьне перэнёс Хрыстос.

Праўда, што йшчэ далёка той час, калі слова заменіцца ў дзела.

Але Хрыстос, пакідаючы зямлю, даў нам адзін бязцэнны дар: *надзею*. І прыйдзе час, калі чэлавечэство, прайшоўшы праз праўдзівае пекла крыўд, насільства і здзеку, адродзіцца нанова, і міласць братня і любоў запануюць на зямлі.

Многа гора і сьлёз, многа бед бачылі мы і будзем бачыць. Крывёй людзі здабывалі ўласць над людзьмі, і німала крыві праліецца перш, чым новы лад настане на сьвеці. Але лад гэты прыйдзе—павінен прыйсьці: на што-ж іначэй нясьлі-бы народы свае ахвяры людзьмі і дабыткам на аўтар будучыны?

Не здарма сьвята Ўваскрэсеньне Хрыста--Вялікдзень--спраўляецца вясной, калі сонцэ разрывае путы з лёду. ў якіе была закована земля Прыход вясны у прыродзе гаворыць нам, што настане калісь гэткая самая *весна народоў.*

І ўжо бачым знак гэтаго: вось, будзяцца прыспаные векамі народы, будзіцца аграмадная армія працоўнаго люду, каторы пачынае каваць асновы новаго жыцьця — новай долі.

Многа перашкод стаіць на дарозі да апошняго *вызваленьня чэлавека.* Але наперадзі сьвеціць ясная зорка надзеі, што жаданы ўсім чэлавечэствам дзень — *дзень уваскрэсеньня*—папраўдзі настане.

## З вёскі.

Беларускі народ у высокай меры—народ—грамадзянін. Ен любіць зборышчы, любіць жыць супольным жыцьцем. Беларус гатоў цэлы дзень, залажыўшы рукі у рукавы свайго кажуха, стаяць на вуліцы, калі пазваляе час, ў мароз і холад, абы толькі паслухаць другіх і падзяліцца з людзьмі сваімі мысьлямі і думкамі. А дзе сабіраюцца беларусы вечэрамі, доўгімі зімовымі вечэрамі? Часта сходзяцца да каго-небудз з суседзеў, у каго хата папрастарней. А ешчэ часьцей гэтые зборышчы адбываюцца у крамнікоў — жыдкоў, знайшоўшых прыхільны прытулак між селян. Гэтые крамнікі тайком таргуюць гарэлкаю. Нечэга і гаварыць, якое зло ў сяле гэта таргоўля гарэлкаю. І крамнікі даўно умудрыліся скарыстаць селянскіе зборышчы для шырокай прадажы гарэлкі.

На селянскую цемнату, п'янство, грубасць прыходзіцца часта слухаць нарэканьня Крыўдно тут тое, што гэтые нарэканьня ідуць ад тых людзей, каторые палец аб палец ня выцялі, каб ўнесьці хоць іскру сьвету ў цемнату людзкую. Наша школа і цэрква рэдка калі бываюць у згодзі з селянамі, у той згодзі, пры каторай школа, цэрква і народ робяцца як бы адным цэлым. І школа, цэрква і народ жывуць кожны па сабе. У народу ёсць патрэба у такіх урадах, дзе б яго духоўные сілы маглі знайсьці разумны сход. Але ніхто аб гэтым не паклапоціцца. Даўно пара прыйсьці на падмогу народу. Самая лепшая справа прыяцелёў народу была б тая, калі б яму пастроілі бібліотэку, дзе б ён мог чытаць і вучыцца. Аб гэтым варта дужа падумаць.

Т. Г.

## Колькі слоў аб хутарох.

За некалькі апошніх гадоў у нашым краі, як і ва ўсей Расеі, дужа энэргічна вядзецца так званае «землеусторйства», каторае ідзе к таму, каб селяне пакінулі обшчыннае ўладаньне зямлёй ды разышліся на вотрубы і хутары. Для Беларусі справа скасаваньня обшчыны мае ня гэткае вялікае значэньне як для Вялікарасеі, дзе дайжэ уся селянская земля у обшчынным карыстаньні. У нас толькі дзе не-дзе, на усходняй ды паўночнай старане краю, спатыкаецца обшчына і дзеля гэтаго цэнтр правіцельственнаго землеустройства для нашаго краю, гэта пераход з вясковаго жыцьця на хутарское.

Наагул да селян куды лягчэй даходзіць пахвала хутароў чым ганьба, але ўсё-ж такі на хутары яны расходзяцца не надта ахвотна. Няўжо-ж тут толькі цемната вінавата? Гэта тым болей дзіўна, што якраз найболей развітые, ачытанные і крытычна думаючые людзі у вёсцы, як с пасярод селян так і інтэлігентоў, якраз працііўнікі хутароў. Чаму яно гэтак?

# ГУТАРКІ.

### Гусляр.

Стары быў чэлавек, а любіў гусьлі свае і сьпеваць любіў. Бывала толькі сонейка захадзіць стане, а ён возьме гусьлі свае, выйдзе на прызбу хаткі старой і грае і пяе..

Быдла жануць дамоў пастухі, работнікі і работніцы ідуць с поля, і так, праходзячы каля тэй хаткі кожнаго жаль агорне, ці нават сьлёзы прабьюцца з вачэй, — бо складная і жаласьлівая нота песьняў яго чэпляла душы людзей жывых. Жывёла нават, кароўка, ідзе, ідзе, а як параўняецца с хатай, гдзе гусьляр сядзіць,—стане, паглядзіць так сумна, як-бы сказаць нешта хочэ, але мыкне працягла і глуха і пойдзе паволі. . . . .

. . . . . . . . . . .

— Не грай ты, годзі табе,—кажэ да яго жонка старая, — не наводзь ты смутку на людзей. Бач, жывёла нават і тая мыкае... Бэзжаласьлівы ты!

Сьціхне гусьляр; уздыхне, ды пойдзе сабе з гусьлямі у поле. Ночы бывала цёмные цёмные, ды яшчэ дождж, ды вецер завывае,— а з некуль зьмешаўшыся з ветрам чутно, як нехта плачэ, ды галосіць здаецца. . . . .

. . . . . . , . .

Пеяў гусляр!..

І сьмеяліся людзі з яго, што і ночы не баіцца і сну яму німа.

### Гордасць.

Жыў на сьвеці горды чэлавек, ды такі горды, што дзівіліся людзі з гордасьці яго. Бывала горды чэлавек с панам, альбо паняй якой, ці з вураднікам гаварыць пачне, — дык кожны з іх паважна і задумённа гаварыў з ім, бо знали гордасць яго і баяліся каб ня укрыўдзіць яе, — бо знали гаспадара яе і баяліся яго.

Бо так даводзіў горды чэлавек,—што німа на сьвеці ні мужыкоў ні паноў, ні чыноўнікоў, а ёсць (ці павінны быць) людзі. а калі ты чэлавек, маеш у сабе сэрцэ, душу і розум, — то ты горды, а гордасць — гэта спазнаньне хто ты такі.

Было раз, калі гордаму чэлавеку паня нейкая сказала: — «ты мужык» — дык ён адказаў ёй, што: «слово **«мужык»** колісь мело другое значэньне, а вы мабыць гэтаго ня ведаеця і мусяць бацькі вас так навучылі бо слова гэта перакручэна і ужываецця вы яго як лаянку, а хто лаецца, хоць бы якім словам,— той не мае гордасьці, а значыць спазнаньня самога сябе, значыцца — той не чэлавек,

. . . . . . . . .

І сьмеяліся людзі з яго:—як гэта, каб паня, ды ня ведала!?

### Барэц.

— Сымонка,—кажэ бацька,—ня здужаеш ты яго, не парывайся! Паглядзіш, што апошніе рэбры табе паламае. Кінь, сынку, годзі табе!..

— Не, тату, не, я здужаю яго! Я яго здужаю! Ен—то сільнейшы за мяне, але здужаю я яго, бо вачэй ён маіх баіцца... Вочы мае сілу маюць, сам ведаеш... а калі голасам сваім скажу яму: „ты ужо здаўся, ды табе толькі здаецца. што не“—дык і усё будзе, мне больш і ня трэба нічога...

— Ведаю я ўсё гэта, ведаю. Знаю я дастаткі твае, — але што табе з барадзьбы гэнай?.

— Трэба, тату, ўмець бароцца, трэба ўмець. Заўсёды той больш зрабіць можэ, хто умее рабіць, а каб умець бароцца — трэба загартаваць сябе, а бароцца—ух як трэба!..

І йшоў Сымон на паедынак. Цяжка было яму. Бывала кроў горлам пойдзе, пасінее ўвесь, — але усякаго здужае!

Сам худы, шчуплы і ня ведама:--скуль тая сіла? Толькі блісьне вачыма і страх праціўніка агартае, а скажэ, і ужо здаўся... Пасьля паложыць Сымон руку на плечы таварыша таго і скажэ:

— Сілы многа, ды веры мала ў цябе, браце ты мой, веры трэба болей . . .

. . . . . . . . .

І дзівіліся людзі з яго: Што яму з барадзьбы гэнай?..

### Любоў.

Хадзіў па ваколіцы жэбрак нейкі і ўсе яго любілі.. Ен сам любіў усіх і усё і многа аб любові сваёй гаварыў людзям.

Нікіпар Каляга прышоў с цэрквы, дома трохі абярнуўся і недзе выйшоў. Калі жонка хапілася што німа мужа дома, то як бы ей хто сказаў, што тут ёсць нешта благое. Яна стала яго шукаць, кінулася і сюды і туды, а мужа ўсё нет. Аж нарэшце знайшлі яго у суседнім таку павесіўшымся. Прычына, кажуць, тая, што у яго ёсць с паўтары сотні доўгу. Летась яго сын ехаў у Амэрыку, дык ён пазычыў у суседа грошы яму на дарогу, а сын як заехаў, дык сперша толькі два лісты бацьку прыслаў, а грошы дык і ня думаў слаць. Цяпер сыну напісалі каб ехаў дамоў, бо німа каму зямлі дагледаць.

*Жаваранак.*

## З Міншчыны.

*Вёска* **Стрыева**. *Мінск. губ. Ігуменск. павету.*

У пачатку марца з гэтай вёскі мужчыны, што цягалі купецкі лес, сабраліся у вёску Забалоцьця да купца на рашчот між каторых быў Рыгор Ліс. Посьле расчоту усе пашлі адведаць патаёмные шынкі. Адзін Рыгор хацеў ісці дамоў, помнючы тое, што за гэтые грошы трэба купіць хлеба, але убачыўшыся с кумам падумаў што трэба выпіць хоць с поўкварты і пазваў кума к Янкавай Стэпя. Да вечэра яны чуць ня ўсе грошы прапілі. С слюнявымі пацалункамі распрашчаўся Рыгор с кумам і ужо прыцемкам пашоў дамоў. Прыйшоўшы дамоў Рыгор пачаў чэпляцца да жонкі, але жонка ведаючы пьяную натуру мужа ніўчым яму не пярэчыла і старалася найскарэй улажыць спаць Калі ён заснуў жонка агледзіўшы яго кішэні знайшла астатак не прапітых грошы і схавала іх у куфар Назаўтра устаўшы Рыгор хацеў ісці у Забалоцьця пахмеляцца, але агледзіўшы свой капшук і не знайшоўшы у ім ні капейкі, задумаўся. Гадзіны праз дзьве ён надумаўся прадаць цялё, каторае было пушчэна на племя. Але гэта яму не ўдалося, бо жонка стала плакаць і сварыцца не даючы яму вязаць целяці. Тады ён надумаў папужаць жонку, вось як. Пайшоў у лес і лёг пад бярозкай прытварыўшыся нежывым, сказаўшы аб гэтым меншаму брату і папрасіўшы, каб ён гэтай весткай напужаў жонку. Меншы брат выпоўніў яго прозьбу і калі жонка Рыгорава дачулася што яе Рыгор нежыў, спадохаўшыся, ня ведала што рабіць і паслала дачушку па суседа Мацея. Рыгор доўгв ляжаў пад бярозай, але ніяк ня мог дачэкацца пакуль прыдзе жонка галасіць над ім. Нецікавае надворьe без пары прагнала яго дамоў. Неўзадавэ прыйшоў і Мацей і убачыўшы Рыгора седзячога на лаві, стаў яго лаіць і віншаваць з мёртвых паўстаньнем.

Дык во да чаго даводзіць чэлавека гарэлка!

*В Русы.*

## С смаленшчыны

((*Сяло Дасугаво Красьненскаго, пав* )

— «У сяле хуліганство» і т. д. пішэ нейкі інтэлігент с села Дасугава у «Смаленскім Вестніку». Што гэта за крык? Хто гэта баіцца, ці жаласць каго ўзяла? Гэта ня крык, гэта не плач, гэта брэхня — брэхня інтэлігэнта вёскі, каторы павінен працаваць над аздароўленьнем жыцьця селяніна, вучыць яго а не брэхаць на свайго вучня. Хто вінен, што селянская маладзеж бьецца, брежэцца, калечыцца? у гэтым многа хто вінен, але і ты п. інтэлігент у тым лік! Дужа і ты вінен. Лепей было-б каб заместа пісаць нападкі у газэту, ты п. інтэлігент на часіну пазадумаўся: хто ты ёсць і што павінен рабіць. І тады-б ты убачыў-бы, што забываеш крыж, які патрэбна табе нясьці на плечах сваіх, забываеш тую сьцежку, па якой трэба ісці. Ясна убачыўбы што шлёпаешся ты у гразі, у сьметніку. Дзеля гэтаго хлопцы бьюцца, дзеля гэтаго у сяле не красуе сонейка залацістае, а аблажыла абапол сярдзітая хмара, бо німа цёплаго веперка, німа таго што-б змагло разагнаць цемень. І не адным вучыцелям патрэба працаваць над асьветай вёскі. Павінны працаваць і сьвяшчэньнікі і аграномы і інш., кожны хто хоць трохі бачыць сьвету. А гэтаго німа. Наш селянін пакуль што надта бярэць прыклад з духоўных асоб. Ня робюць што трэба і вучыцелі. У Дасугаве ёсць двохкласнае вучылішчэ, дзе с пяць вучыцелёў. У апошніе два гады вучыцелі гэтаго вучылішча усё брэхаліся, біліся, нават друкавалі розную брэхню адзін на аднаго у газэтах. З іх бралі прыклад вучні і жыхары села Дасугава. А то перэд Калядамі інтэлігенція Дасугава зрабіла во якую штуку. У салі жаноцкай аднакласнай школкі інтэлігенція прэдстаўляла камэдію «Жанідзьбу» Гоголя. На рэпэтыціі пусьцілі зірнуць і вучнёў малышоў. А на вечарынку панаехало у сяло шмат людзей: вучэніцы жаноцкай сэмінарыі, дочкі папоў с суседніх вёсак і сёл і многа іншых паненак. Поўна саля Дужа вясёла было. Рагаталі да раньня. А якіе скокі, жарты. Была і выпіўка.. Вясёла правялі тую ночку і селянскіе вясковые хлопцы Дасугава (іх не пусьцілі зірнуць на прэдстаўленьня, як і іхніх бацькоў і матак с сёстрамі). Яны сабраўшыся у груд, патрасьлі худзенькіе кішэні, скінулі заробленые мазалямі медзякі і купілі гарэлкі, каб так сама павесяліцца, бо яны відзілі праз акно як гуляюць «вучоные людзі». З гарэлкай зайшлі яны у закавулак і там на сужалцы з горлачка насмакталіся. А апасьля, вясёлые з брыдкімі песьнямі пашлі па сялу. Каля поўначы біліся два хлопцы. Былі нейкіе крыкі, стукі палкамі у вокны, дзікіе крыкі... На другі дзень паненкі паехалі дамоў, а жыхары села Дасугава не далічыліся шмат цэлых вокан.. І гэта называецца хуліганства. Каб заместа пісаць у газэту, пан інтэлігент сабраў тых хлопцаў з іх бацькамі, маткамі, сястронкамі і перад імі сыгралі «Жанідзьбу», ці што прачыталі расказалі. Тады можэ і не так часта насіліся-б на вуліцы брыдкіе словы песень, не былоб дракі... Во чаго трэба дабівацца п. інтэлігенты. Не забывайця, што ваш крыж — вялікі крыж.

*І.—Д—нец.*

*Вёска* **Седіч** *Могіл. губ. Быхоускаго павету.*

С палавіны студня стала цёпла. Сьнег сагнало, паргазнеўшая дарога падсохла і селянін затарахцеў на калёсах У цёплы сонечны дзень калёсы напаміналі лета. Скора прыляцелі шпакі (гракі), жаваранкі, вуткі, чайкі, буцяны. На днях раскрыў свае шырокіе грудзі Днепр.

Селяне сядзелі без заработкоў: ніхто не нанімаў вазіць тавароў, лесу. Загэта у пустым кішэні ешчэ пусьцей стала і на стале у пост бульбачка, без селядца.

Дроў--ламья троху панавазілі с казённаго лесу за 15 вёрстаў ад гэтуль. Есць тут лес за вярсту, але пан с 1905 году ніяк не улашчыцца за самавольную парубку і не дае ні цуркі.

Нідаўна у нас прыкінулася хвароба на сьвіньней і селяне іх валочуць на поле або у канаўкі к Дняпру Калі я сказаў, што з гэтаго нікολі не звядуцца хваробы, мне атказалі: — «Во, ці гэта прыстане? А калі і прыстане, то ніхай-жэ здохне і у другога!» — І вось, стараючыся перэгнаць хваробу на другі двор, ён валачэ са свайго двара сьвіньней с першаго да апошняго.

У вёсках Хадуцічах і Касічах здыхаюць коні ад сібірскай заразы. Аттуль ездзюць цераз нашу вёску і поюць коні каля калодзезей. Гэтым яны могуць перэдаць хваробу і у нашу вёску. „Трэба зняць вёдры“— кажуць селяне, але далей гэтаго дзела ня йдзе.

*Саука Каваль.*

# З усіх старон.

### У Пецярбурзе.

Увесь апошні тыдзень у Пецярбурзе адбываліся обыскі і арэшты. Былі дэмонстраціі работнікоў і чэкалі новых дэмонстрацій, дзеля гэтаго у прыгорадах і каля унівэрсытэту сабіралі многа паліціі. На металургічным заводзі, гаспадары заводу, адмовіліся заплаціць работнікам за час забастоўкі і тамізноў неспакойна. Завод акружэн паліціей:

Газэты пішуць, што у часе стычкі паліціі з дэмонстрантамі на Пецергофскім шоссэ, дэмэнстранты закідалі паліцію каменьнямі і поўцагелкамі. Ранілі штабс-капітана Пісарэнка. Адзін з дворнікоў схапіў за руку работніка, каторы раніў Пісарэнка, работнік ударыў дворніка у жывот напільнікам і раніў. Другіе дворнікі і гарадавые схапілі работніка і адвялі у участак; пры работніку знайшлі чырвоны прапар і проклямаціі. Дэмонстрантоў разагналі. Хоць на многа якіх фабрыках і заводах пачалася работа, але настраеныне сярод работнікоў падвышэнае. На некаторых заводах увальняюць работнікоў. Бецната даецца знаць работнікам, бо якраз перэд сьвятамі страцілі заработак.

### Філарэцкае таварыство.

На апошнім заседаньні палаты Міхаіла Архангела Пурышкевіч прачытаў даклад аб аткрыцьцю ім Філарэтоўскаго таварыства. Статут гэтаго таварыства ураджэн на зьездзі паноў-дварaноў і зацьверджэн міністрам унутрэнных спраў. Заложэно таварыство з мэтай прыйсці у помач міністэрству народнай асьветы у яго змаганьні с „крамолай“ у школах У члены закладчыкі запісалося 205 душ, сярод іх 20 душ дэпута-

---

было. Ідзе яна па вуліцы, дык ніводнае вока яе не праміне, — кожны гляне, ды абліжэцца, а яна ідзе сабе, хоць-бы што. Ідзе праз сад ці луг кветкі пахучые гнуцца ёй па ногі, галіны прыхіляюцца, а яна ідзе як царыца і недбае...

Зоркі гасьлі перад яе вачыма!..

Семнацаць сватоў перэд Каляды, і семнацаць пасьля Каляд было—ня хочэ ісьці замуж.— «Прывязіця мне,—кажэ такого як я, тагды пайду — кажэ...

І марнее так у дзеўках, толькі ешчэ харашэйшая робіцца.

— Што-ж, гэта яна — кажуць людзі, — і хочэ як відаць, каб прыяцеля меці, да скуль жэж ей узяць такого як яна.

— Шкада яе.

А пасьля сталі сьмеяцца з яе—Дурная. Кажуць людзі.

. . . . . . . . . . .

Хоць бяз носа, абы харошы — адказывае яна!..

## Слова.

Слова павінно быць моцнае як загартаваная сталь. Слова павінно быць гучнае як гром, калі ён ва ўсей сваей сілі ударае ў часе найстрашнейшай буры. Слова павінно быць роўнае, як лінія па каторай мы глядзімо на зорку. Слова павінно быць як найдаражэйшы у сьвеці брыльянт найлепей вышліфаваны. Слова быць павінно прыятнае і мілае для вуха, як казачны хор сьпеву уселякіх галасоў— жывучых у часе вясновай раніцы. Слова, як цудоўнае лекарства—бальзам, павінно лечыць падупаўшые у хваробі сваей душы і сэрцы. Слова павінно быць над усім, а ўсё ад слова Усё гэта у слові павінна быць разам і слова ва ўсім

Так казаў вучыцель красамоўства сабраўшымся каля яго вучэнікам сваім.

— Бо хто ня можэ даць слова жывога, альбо на мігі паказаць яго, або нават хто німае яго у глыбіне сэрца свайго, у глыбіне душы і розуму, — той ня можэ быць красамоўцам...

— То як ж нямы, альбо той, — каторы хоць язык і мае ды не зусім паваротлівы можэ быць красамоўцам?—пыталіся вучэнікі вучыцеля свайго.

— Кажу вам, хто уловіць усю моц і цудоўнасць слова, той можэ меці яго. І нямы можэ быць красамоўцам і безпаваротлівы языком можэ быць красамоўцам. Бо красамоўство ня толькі у тым што кажэ, але і ў тым, што паняць яго можна.. Ці ня чуеця вы як птушкі шчабечуць, як зычаць пшчолы, як шуміць вада, як лес гамоніць? Ці лепшай красамоўнасьці хочэця вы дайсьці як мова прыроды Божай? хіба, што языка не мае ўсё гэта, — а сколькі нашэпталі яны чуткаму паэту, колькі ён кніг напісаў?!

— Кніг многа папісаў паэт, толькі мы не чыталі іх,—казалі вучэнікі.

— Трэба чытаць. Трэба кнігі паэта чытаць вам, калі хочэця быць красамоўнымі ў душы і сэрцы вашым. У кнізі паэта напісана тое слова аб каторым кажу вам: Што слова павінна быць над усім а ўсё ад слова.. Краса на зямлі быць павінна.

— Ешчэ скажу вам аб слові: Слова павінна быць тое золато і срэбра каторым на тавары абменіваюцца народы паміж сабой, даючы добры тавар за добрые грошы. Часамі даюць дрэнны тавар за добрые грошы і хвальшывые грошы за тавар. Але вы, калі хочэця быць красамоўнымі — значэ меціь слова — то і вы меняйцеся паміж сваімі і заморскімі народамі славамі, ды толькі не бяручы прыкладу ад тых, што за праўдзівае даюць фальш і за фальш праз няведаньне сваё даюць добры тавар. А дарыця ці меняйцеся словам, аб каторым гавару вам: што слова павінно быць над усім, а усё ад слова, — значыць: калі слова будзе ня шчырае, то яно такі і плён дасць. А красамоўца павінен меці сумленьне чыстае і сэрпэ добрае іначэй красамоўствам сваім— ці дзелам пародзіць зло.

— І памятайця, і будеця крэпкімі, каб усё добрае і прыгожае было у слові вашым а слова будее ваўсім.

**І. Пілінаў.**

тоў, 5 душ членоў Гас. Рады, некалькі епіскопоў, прафэсароў, земцоў і чыноўнікоў. Новае таварыство выклікало да сябе зацікаўленьне і прыхільнасць у вышэйшых кругах, дзе як вядома цяпер дужа цікавюцца школай. Гэта маладая „патрыотычная“ арганізація, перш за ўсё патрэбуе цяпер вялікіх коштоў і Пурышкевіч радзіць паставіць так таварыство, каб правіцельство само паспяшыло з грашавой падмогай.

Трэба спадзевацца, што Філарэтчыкі „папрацуюць“: заскрыпяць перья пішучы даносы, заскрыгаюць замкі... і пацячэ залатая рэка на.. „патрыотоў“.

**Новы цыркуляр.**

Кассо апублікаваў цыркуляр, каторым забараняецца вучыцелям без асаблівага пазваленьня прыймаць учасьце у працы гарадзкіх і земскіх камісій, дзеля таго, што запрошэные у гэтые камісіі вучыцелі часта высказываюць погляды, праціўные поглядам міністэрства народнай асьветы.

**Праклямаціі.**

У Лібаве арэштавалі трох невядомых, каторые хацелі вынесьці с прыбыўшаго у Лібаву поезда скрынку з майскімі проклямаціямі.

**Каму добра на Русі.**

„Руск Знамя“ паведамляе, што правіцельство што год дае на выданьне „Вѣстника Саюза“ субсыдіі 23,000 рублёў.

**Забастоўкі работнікоў.**

У Ніжнім Ноўгарадзе, Харкове і Рызе у звязку з рухам сярод Пецярбурскіх работнікоў пачаліся забастоўкі. Было багата обыскоў і арэштоў.

**Каму скончылася, просім прысылаць падпіску.**

## ЖАРТЫ.

**Прыдумаў.**

*Жонка да мужа*: Падумай, Янка, як мы будзем жыць: карова—толькі скура ды косьці, кабыла—дзесяць злотых варта, самі мы без здароўя... Думай ты, я нічога не магу прыдумаць ..

*Янка* (насамперш закурыў люльку, сеў. к.ыху падумаў і кажэ): От, ты б ба, у цябе волас доўгі, а розум кароткі.. Як ня думай, а адзін толькі астаўся спосаб: каб ты памёрла, а я з другой ажаніўся, былаб новая жонка маладзейша, добрая работніца, прынеслаб сто рублёў пасагу, кабылу і кароў са дзьве прывела-б, от і пашла-б лепей гаспадарка наша.

*Жонка:* А! каб ты звар'яваўся!. Бач, што надумаўся, як мудра! От так на пагляд абібок. палена...

*Муж:* Ну, сціхні, не лайся! ла што я казаў? Ды ешчэ-ж жыва...

*Я К. Д—ка.*

**Не разабраў.**

Заначэвалі у адным мейсцы разам: жыд, пан і селянін.

Ноччу, калі яны ляглі спаць, пан крэпка раскашляўся і недаваў спаць жыду. Жыд слухаў, слухаў ды пачаў лаяць селяніна.

— Што-ж ты кашляеш, мужык ты, ці ты ня ведаеш што тут пан спіць? А ты, каб цябе шляк трапіў, кашляеш і перэшкаджаеш вяльможнаму пану спаць.

Пану стала прыкра дык ён кажэ:—Што ты там лаешся, жыдзе,—гэта я сам кашляю.

— А-а, гэта пан! то выбачайця пане! Прашу пана кашляць сабе што найболі, цэлы век без перэстанку, ані мінуту не спыняючыся і што раз крапчэй ..

*Н. Аурэйцэвіч*

## Шарада № 4.

*Першы* — муж вучоны, важны;
Носіць чын такі не кажны,
Хоць па-просту на наш лік
Ен ня больш як чараўнік.

Наша *трэцяя-другая*
Будзь нейкая такая:
Знала рэчкі бдрагі
І паганскіе багі.

Ну, а *трэцыя* с *чацьвёртай*
Рэчка ў дальню даль запёрта,
Слаўна золатам для нас
І крывёй ў вапошні час.

А *уся*—жаночэ іме,
Кожны знойдзе між сьвятымі.
Далей буду ўжо маўчаць,
Бо й так можна адгадаць
К—а.

Разгадка Шарады № 3:
Са—ла—ду—ха.

Акуратные разгадкі прыслалі: *Каролiна, Бронiслава, Свідэрская Я. Башкевіч, А Давідоускі* і *I. Фарботка* (складным вершам).

Рэдактар І. Луцэвіч.
Выдавец А. Уласоў.

Знаменітые швэдзкіе цэнтрафугі
„ДІАБОЛО“
а такжэ масляркі, ціскачы, жбаны да малака, студзенікі, цадзілкі, фільтры, фарба да масла і уселякіх малачарскіх прылад вялікі выбор
Суліць Зыгмунт Нагродзкі
Вільня, Завальная вуліца № 11.
Цэннікі на жаданьня высылающа адваротнай почтай.

Віленскае і Ковенскае Сельска-гаспадарскіе Таварысвы
устраіваюць у Вільні 15—23 жніуня 1914 г.
ВЫСТАУКУ
Културы торфянікоу і торфведаньня.
Тэрмін запісоу экспонатоу—15 чэрвеня 1914.
Адрэс выставачнаго комітэту: Вільня, Віленскае Сельска-Гаспадарске Таварыство (Завальная 9).

Крэпка Радіактыуные мінэральные воды і найлепшая Клíматычная станція
ДРУСКЕНІКІ
Гродз. губ. на берэзі рэкі Нёмана і Ротнічанкі. Лечуцца хваробы: рэматуз, падарга, хваробы жывата і кішок, сэрца, залатуха, хваробы мачавых каналоў, жапоцкіе хваробы, анэмія, нервовая немач, нералюшы і др. Мейсцовасць прыгожая. дужа сухая акружонная сасновымі лесамі. Жыцьцё таннае, развaг многа. Кумыс, кефір. На жаданьне Кантора вод высылае праспэкты.

Фосфорытны завод
ІВАНА ВАСІЛЬЕВА
Ст. Сешчынская Р. О. жал. д.
суліць на ўдабрэньня палеў, сенажацеў, садоў і гародоў
фосфорытную муку з глаўканітных фосфорытоў, маючую у сабе ад 12 да 16% фасфорнай кіслаты і да 30% калі.
Тэрмосфат з абпаленых фосфорытоу маючы у сабе ад 18 да 23% фосфорн. кісл. 75% распушчаемасці. Прэйс-куранты рады і отзывы безплатна.

ОТКРЫТА ПОДПИСКА
1-й годъ изданія — на 1914 годъ. — 1-й годъ изданія
на земскій двухнедѣльный журналъ
„Вѣстникъ Могилевскаго Земства“
изданіе Могілевскаго Губернскаго Земствва.
Выходитъ выпускаи до 2-х и болѣе печатныхъ листовъ.
Подписная цѣна на 1914 годъ два рубля съ доставкой и перасылкой.
Пробны нумэр, по трэбованію, высылается безплатна.
Отдѣльный номеръ 15 кап., съ перасылкай 20 кап.
Адресъ: Городъ Могилевъ губерискій, Редакція „Вѣстника Могилевскаго земс ва“. Телефонъ № 285. Почт. Ящикъ № 37.

Слаўные СЕЯЛКІ чэскай фабрыкі МЭЛІХАРА ў Брондыс: лемешные Унікум, комбінаваные Імпэратар, да штучных навозоў Полёнія і талерачные.
Сеялкі раскідаючые Эккерта 12, 10, і 8 ступовые самай навейшай канструкціі.
Сеялкі амэрыканскіе Супэріор лемешные комбінаваные і талерачные.
Сеялкі да навозоў арыгінальные Вэстфалія—Голіат Куксмана.
Плугі адноскібовые Сухэняго.
Двохскібоўцы Сухэняго, Завадзкаго і суцэльна стальные Эккерта.
Культыватары, бароны, валы, качалкі.
Значнікі і абсыпнікі. ямнікі да бульбы.
Машыны і прылады малачарскіе.
суліць ЗЫГМУНТ НАГРОДЗКІ
Вільня, Завальная № 11.

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.